# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (сяр.XIII ст. – 1569 г.)

1. Утварэнне Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага




У п. XIII ст. беларускія землі знаходзіліся ў стадыі палітычнай раздробленасці, былыя палітычныя цэнтры – Полацк і Тураў – слабеюць у пастаянных сутычках з крыжакамі і

Верхняе і Сярэдняе Панямонне (*паўночна-заходнія землі сучаснай Беларусі (Гродзенская вобл.) і часткова ўсходнія землі сучаснай Літвы)* было славяна-балцкай кантактнай зонай, дзе складаліся перадумовы для узнікнення новай дзяржавы.





- Працэс утварэння асновы ВКЛ пачаўся ў **сярэдзіне XIII ст.** Пачатак паклаў палітычны саюз усходнеславянскіх панямонскіх гарадоў з мацнейшым балцкім князем (кунігусам) **Міндоўгам**.

# ПРЫЧЫНЫ ЎТВАРЭННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

- ✔ Знешняя небяспека з боку крыжакоў (паўночны захад) і татара-манголаў (паўднёвы усход)
- ✔ Развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, гандлю, рост гарадоў
- ✔ Паглыбленне сацыяльнай дыферэнцыяцыі і супярэчнасцей ў грамадстве

# Цэнтрам аб’яднання зямель стаў **Наваградак**




*Гістарычная рэканструкцыя горада*

**Ён быў аддалены ад раёнаў змагання з крыжацкай і татарскай агрэсіяй, меў высокі ўзровень развіцця сельскай гаспадаркі, рамяства, гандлю.**

# Канцэпцыі ўтварэння ВКЛ

- **Літоўскае заваяванне беларускіх зямель** (*савецкая і літоўская*)
- **Беларуска-літоўская дзяржава** (*У.Ігнатоўскі*)
- **Беларуская дзяржава** (*В. Ластоўскі, М.Доўнар-Запольскі, М. Ермаловіч*)
- **Поліэтнічная дзяржава** (“цэнтрысцкая”)

У этнічным плане **<u>ВКЛ – пераважна ўсходнеславянская дзяржава</u>**, 3/4 насельніцтва – ўсходнія славяне (беларусы, рускія, украінцы).

З XV ст. дзяржава стала называцца **<u>“Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае”</u>**

- **<u>“Літва”</u>** – верхняе і сярэдняе Панямонне
- **<u>“Русь”</u>** – верхняе Падзвінне і Падняпроўе
- **<u>“Жамойція”</u>** – заходняя частка сучаснай Літвы



# 2. Асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі ВКЛ

# Пашырэнне тэрыторыі і ўмацаванне дзяржаўнай улады

Палітыку пашырэння тэрыторый распачаў **Міндоўг** (1248-1263), аб'яднаўшы "Літву Міндоўга" і Наваградчыну.

**Войшалк** (1264-1267) далучыў Дзяволту і Нальшаны.

**Віцень** (1293-1316) далучыў Полацкую, Гарадзенскую, і Берасцейскую зем






Найбольшы рост дзяржавы пачаўся пры **Гедыміне** (1316-1341). У 1323 г. ён пераносіць сталіцу ў **Вільню**, да ВКЛ далучаюцца Віцебскае, Менскае, Турава-Пінскае княствы. Тэрыторыя павялічваецца

# Гара Гедыміна ў Вільні





Вялікі Князь Альгерд (каля 1296-1377)

Пры **Альгердзе** (1345-1377) ВКЛ выступае з палітычнай праграмай аб’яднання ўсіх усходнеславянскіх зямель і прэтэндуе на ролю спадкаемцы традыцый старажытнай Русі.
Да ВКЛ далучыліся Чарнігава-Северскае, Мсціслаўскае, Бранскае княствы. Пасля разгрому татараў на р. Сінія Воды ў 1362 г. – Кіеў і Падолле, пасля барацьбы з

- У **1385** г. Вялікі князь літоўскі **Ягайла** заключыў дагавор з Каралеўствам Польскім і стаў каралём польскім (Крэўская унія). З гэтага часу дзве пасады сумяшчае адзін чалавек (акрамя Вітаўта 1392-1430). Унія насіла



Вялікі Князь Ягайла (1348-1434)

Пры **Вітаўце** (1392-1430) ВКЛ дасягнула максімальных межаў і стала адной з буйнейшых дзяржаў у Еўропе. Землі ВКЛ займалі абшары ад Балтыйскага да Чорнага мора.








Пачынаючы з XVI ст. ВКЛ пачынае страчваць тэрыторыі.

- **Гедымін** умацоўвае цэнтральную ўладу, **Вітаўт** імкнецца замацаваць за дзяржавай статус каралеўства.
- Напачатку далучаныя да ВКЛ землі захоўвалі мясцовыя палітычныя традыцыі і кіраваліся па прынцыпу “***мы старыны не рухаем і навіны не ўводзім***”.
- З п. XV ст. замест княстваў ствараюцца ваяводствы, адбываецца уніфікацыя адміністрацыйна-дзяржаўнага кіравання.

# Шляхі ўваходжання беларускіх зямель у склад ВКЛ

| **Пагадненні (дагаворы)** | **Падначаленне (без дагавору, сілай)** | **Дынастычны шлюб** |
|---|---|---|
| Полацкае княства | Некаторыя княствы Заходняй Беларусі | Віцебскае княства |

# Барацьба за трон і грамадзянскія войны

- Вялікакняскі трон быў замацаваны за дынастыяй Гедымінавічаў.
- Заканадаўчая незамацаванасць прынцыпаў спадчыннасці трона спараджала перыяды барацьбы паміж нашчадкамі правячай дынастыі, куды ўцягвалася усё кіруючае саслоўе.
- 1341-1345 гг. Яўнут і Альгерд
- 1377 Ягайла і Андрэй
- 1382 Ягайла і Кейстут
- 1432-1436 Свідрыгайла і Жыгімонт, княства падзялілася на “Рускае” і “Літоўскае” па рэлігійнаму прынцыпу.

# Рэлігійныя адносіны

- Першапачаткова знаць ВКЛ была праваслаўнай, пасля заключэння Крэўскай уніі (1385) пачынаецца працэс акаталічвання шляхты, бо католікі мелі палітычныя і маёмасныя правы, у якіх былі абмежаваны праваслаўныя (Гарадзельская унія 1413).
- У 1 п. XVI ст. у ВКЛ прыходзіць Рэфармацыя і пратэстантызм становіцца рэлігіяй вышэйшай знаці.
- З 2 п. XVI ст. пачынаецца дзейнасць Контрэфармацыі (ордэн езуітаў) і адбываецца новы вiток акаталічвання шляхты.

Узмацнее ВКЛ і пашырэнне яго тэрыторый прыводзіла да ваеннага супрацьстаяння з суседнімі дзяржавамі.

У В

дзе












# Каралеўства польскае

- У п. XIV ст. былі ваенныя сутыкненні з-за тэрыторый (Валынь)
- З 1385 г. (Крэўская унія) пачынаецца паступовае збліжэнне двух дзяржаў, уніфікацыя грамадска-палітычнага ладу, што прыводзіць да заключэння дзяржаўнай уніі ў 1569г. і утварэння Рэчы Паспалітай двух народаў.



# Тэўтонскі ордэн

- У XIII- XV стст. крыжакі былі самай значнай небяспекай для ВКЛ.
- Крыжакі вядуць захопніцкую палітыку на паўночным захадзе ад ВКЛ, захопліваюць землі прусаў, Жамойцію, робяць шмат набегаў на славянскія землі ВКЛ.
- У сяр. XIV ст. Альгерд і Кейстут ажыццявілі каля 30 паходаў на крыжакоў. Давыд Гарадзенскі ўдала бараніў землі у 1314-1324 гг.
- У 1409-1411 гг. ВКЛ і Польшча вядуць Вялікую вайну супраць Ордэна
- ***15 ліпеня 1410 г пад Грунвальдам*** адбылася бітва у якой Ордэн быў



Я. Матэйка Грунвальдская бітва,
1878

# Залатая Арда, Крымскае ханства

- Сутыкненні з Залотой Ардой пачаліся пры пашырэнні тэрыторый ВКЛ на поўдзень і усход у XIII-XIV стст.
- 1362 г. перамога Альгерда пры Сініх водах.
- 1380 г.удзел войскаў ВКЛ у Кулікоўскай бітве.
- 1399 г. – бітва на Ворксле, дзе сілы Вітаўта і Тахтамыша былі разбітыя войскамі Залотой Арды.
- 1506 г. – бітва пад Клецкам, дзе сілы ВКЛ пад кіраўніцтвам Міхаіла Глінскага перамаглі крымскіх татар.



# Вялікае княства маскоўскае (Рускае царства)





- Сутыкненні ВКЛ з Маскоўскім княствам пачынаюцца ў XIV ст. калі кожная дзяржава імкнулася аб’яднаць вакол сябе ўсходнеславянскія землі. З к. XV ст. пачынаюцца безперапынныя войны.
- Альгерд ажыццявіў 3 паходы на Маскву – 1368, 1370, 1372гг., але не змог замацаваць сваё

- У 1408 г. на рацэ Вугра была замацавана мяжа паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам (200 км ад Масквы)
- Маскоўскія князі пачынаюць умешвацца ва ўнутраныя справы ВКЛ, падтрымліваючы незадаволенасць праваслаўнаў шляхты. 1508 г. паўстанне пад кіраўніцтвам Міхаіла Глінскага.
- Войны XVI ст. з Маскоўскім княствам былі ў асноўным пройгрышнымі для ВКЛ, пачалася страта тэрыторый.
- У 1558 г. пачынаецца Лівонская вайна за выхад Маскоўскага княства да Балтыйскага мора ў ходзе якой ВКЛ падпісвае Люблінскую унію з Польшчай.

# Бітва пад Оршай
8 верасня 1514



# 3.

# ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД ВКЛ

# XIII-XIV стст.

## Неабмежаваная манархія

Уся ўлада належыць **Вялікаму князю**:

Яго функцыі:

- абарона краіны (узначальваў войска)
- выданне законаў
- ажыццяўленне дыпламатычных зносін з іншымі краінамі
- аб'яўленне вайны і заключэнне міру
- распараджэнне дзяржаўнай казной
- прызначэнне на дзяржаўныя пасады

# XV-XVI стст.

# Саслоўна-прадстаўнічая манархія

Улада вялікага князя абмяжоўваецца саслоўна-прадстаўнічымі органамі – **Радай (Паны-рада)** (ад “раіцца”) і **Соймам.**

У склад **Рады** уваходзілі найбуйнейшыя феадалы-землеўласнікі, якіх называлі ***“магнатамі”*** або ***“панамі”***, і вышэйшыя службовыя асобы:

- **ваяводы**
- **канцлер** – кіраўнік велікакняжацкай канцылярыі, хавальнік дзяржаўнай пячаткі
- **маршалак** – старшыня на пасяджэннях рады і сойму
- **падскарбій** – загадчык дзяржаўных фінансаў
- **гетман** – начальнік войска.
- **біскупы** – вышэйшае каталіцкае духавенства



Ваявода і гетман

У канцы XV ст. канчаткова аформіўся другі вышэйшы орган дзяржаўнага кіравання – **агульны (вальны) сойм**, на пасяджэннях якога акрамя паноў-рады маглі прысутнічаць усе феадалы ВКЛ, а пазней – па 2 дэпутаты ад павета.



Багатыя шляхцічы

На соймах вырашаліся пытанні:

- аб вайне і міры
- аб падатках і законах
- аб выбранні вялікага князя.

## XIII-XIV стст.

## XV-XVI стст.

Заканадаўчая, Выканаўчая, Судовая, Ваенная

# КНЯЗЬ

# РАДА

# СОЙМ

Заканадаўчая, Выканаўчая, Судовая, Ваенная

**Неабмежаваная манархія**

Саслоўна-прадстаўнічая манархія

# 4.

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ВКЛ

# Сацыяльная структура

- феадалы
- сяляне
- гараджане-мяшчане



- феадалы
  - Вышэйшай катэгорыі
    - Вялікі князь
    - Князі (магнаты) 19%, валодалі 46% зямлі
    - Паны радныя
    - Каталіцкія біскупы
  - Ніжэйшай катэгорыі
    - Зямяне- шляхта



# СЯЛЯНЕ
## па ступені залежнасці падзяляліся:

**пахожыя**
маглі пераходзіць ад аднаго феадала да другога

**непахожыя**
не маглі пераходзіць

**закупы**
часова залежныя, да выплаты “купы”

**чэлядзь нявольная**
хатнія слугі, не мелі сваёй гаспадаркі

# Па відах павіннасцяў падзяляліся:

**Даннікі**
натуральны аброк, аддавалі ¼ ураджаю

З XV ст. колькасць скарачаецца, захоўваюцца на дзяржаўных землях

**Цяглыя**
паншчына, 2 дні на тыдзень

**Асадныя**
чынш – грашовая рэнта

**Агароднікі**
паншчына, 1 дзень на тыдзень, жанчыны 6

**Слугі**
займаліся кваліфікаванай ці адміністра-цыйнай працай

Усе сяляне палацілі **сярэбршчыну** – вайсковы падатак, удзельнічалі ў калектыўных сезонных і тэрміновых працах – **талоках, загонах, гвалтах** і г.д.

У XVI ст. пачынаецца складвацца фальварачна-паншчынная сістэма

- **Фальварак** – шматгаліновая панская гаспадарка, дзе працуюць прыгонныя сяленя, а прадукцыя накіравана на продаж.
- З развіццём фальваркавай сістэмы павялічвалася паншчына, што прыводзіла да пагаршэн сялян.



# Этапы запрыгоньвання сялян

- **Прывілей князя Казіміра 1447 г.** – афармленне права поўнай уласнасці феадалаў на зямлю.
- **Судзебнік Казіміра 1468 г.** – забарона свабоднага пераходу сялян ад аднаго феадала да другога.
- **Аграрная рэформа 1557 г. (Устава на валокі)** – замацаванне сялян за зямельнымі надзеламі – “валокамі”.
- **Статут ВКЛ 1566 г.** – 10-ці гадовы тэрмін вышуку беглых сялян
- **Статут ВКЛ 1588 г.** – 20-ці гадовы тэрмін вышуку беглых сялян. Сялянін, пражыўшы на зямлі феадала больш 10 гадоў станавіўся

# Аграрная рэформа 1557 г. ( валочная памера)

- Зямля дзялілася на валокі (21,36 га) або 33 моргі ( морг – 0,71 га)
- Згодна з колькасцю і якасцю зямлі вызначаліся сялянскія павіннасці (паншчына, чынш і г.д.)
- Частка зямель адводзілася непасрэдна пад фальварак, іх апрацоўвалі сяляне (прыкладныя суадносіны: 1 панская валока-7 сялянскіх валок)
- Сяляне замацоўваліся за валокамі і трацілі права пераходу да іншых феадалаў




"Устава на валокі"

# Вынікі рэформы

- Рост даходаў дзяржаўнай казны і феадалаў
- Пераход ад падворнага да пазямельнага падаткаабкладання сялян
- Укараненне перадавой агратэхнікі – трохполля і павышэнне вытворчасці сельскагаспадарчай працы
- Разбурэнне сялянскай абшчыны
- Запрыгоньванне сялян
- Развіццё гандлю і таварна-грашовых адносін

# Гарадское насельніцтва



Купец

У беларускіх гарадах жылі купцы, рамеснікі, шляхта з прыслугай і нават сяляне.



Шляхціц




Карэнных вольных гараджан называлі <u>мяшчанамі</u>, г.зн. жыхарамі места – горада. Побач з гарадамі існавалі <u>мястэчкі</u> – невялікія паселішчы гарадскога тыпу.

# Магдэбургскае права

з к. XIV ст. права на самакіраванне

- Выбныя органы самакіравання – магістрат, які складаўся з рады і лавы (судовы орган)
- Горад атрымліваў герб
- Гараджане вызваляліся ад шэрагу падаткаў, у тым ліку і ваеннай
- Ствараліся рамесныя цэхі і купецкія гільдыі – прафесійныя карпарацыі, якія аб’ядноўвалі ўсіх прадстаўнікоў прафесіі, вызначалі кошты на тавары, адстойвалі правы карпарацыі ў



Рэканструкцыя Мінскай ратушы

# Культура ВКЛ у 13- 1 пал. 16 стст.

- **ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАСЦІ**
  - 1. АГУЛЬНАСЦЬ МОВЫ
  - 2. АГУЛЬНАСЦЬ ТЭРЫТОРЫІ
  - 3. АГУЛЬНАСЦЬ КУЛЬТУРЫ І ХАРАКТАРУ ЛЮДЗЕЙ
  - 4. ПЭЎНЫЯ ГАСПАДАРЧЫЯ СУВЯЗІ
  - 5. ЭТНІЧНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ І САМАНАЗВА



# ФАКТАРЫ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАСЦІ :

- 1. ПАЛІТЫЧНЫЯ ФАКТАРЫ (БЫЛО АРГАНІЗАВАНА АДЗІНАЕ КІРАВАННЕ, УВЕДЗЕНА АДЗІНАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА, ШТО СВЕДЧЫЛА АБ СКЛАДАННІ СІСТЭМЫ ПАЛІТЫКА-ПРАВАВОЙ ЦЭНТРАЛІЗАЦЫІ, УЗМАЦНЕННІ ПАЛІТЫЧНЫХ СУВЯЗЕЙ ПАМІЖ РОЗНЫМІ ТЭРЫТОРЫЯМІ ).
- 2. КАНФЕСІЙНЫ ФАКТАР (ПРЫКМЕТА ВЕРЫ СТАНАВІЛАСЯ СВОЕАСАБЛІВАЙ ПРЫКМЕТАЙ НАРОДА).

- 3. ЭКАНАМІЧНЫ ФАКТАР(РАЗВІЦЦЁ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ, УДАСКАНАЛЕННЕ РАМЯСТВА, ПАШЫРЭННЕ ГАНДЛЮ, ПАВЫШЭННЕ РОЛІ БУЙНЫХ ГАРАДОЎ).
- 4. САЦЫЯЛЬНЫ ФАКТАР (ПРЫГОННАЕ ПРАВА САДЗЕЙНІЧАЛА КАНСАЛІДАЦЫІ КАТЭГОРЫЙ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў САЦЫЯЛЬНЫЯ ГРУПЫ З АГУЛЬНЫМІ ПРАВАМІ



# ТЭОРЫІ ПАХОДЖАННЯ БЕЛАРУСАЎ І ТЭРМІНА “БЕЛАЯ РУСЬ”

- **Вялікапольская канцэпцыя паходжання беларусаў (Рыпінскі, Галембоўскі)**
- **Вялікаруская тэорыя (Салаўёў, Ключэўскі)**
- **Крывічская канцэпцыя (Ластоўскі)**
- **Крывічска-радзіміцка-дрыгавіцкая тэорыя (Доўнар-Запольскі, Ігнатоўскі)**
- **Балцкая канцэпцыя Сядова**
- **Тэорыя Піліпенка**
- **Канцэпцыя Ласкова**

Праблема «Белай Русі» даўно з'яўляецца аб'ектам увагі вучоных . Адным з першых ёй стаў цікавіцца Сігізмунд Герберштэйн – дыпламат Свяшчэннай Рымской імперыі



**У 18 ст. даследваннем этноніма “Белая Русь” займаўся вядомы рускі гісторык В.**



Беларусскі архіепіскап Г. Каніскі у «Гісторыі Русаў і Малай Расіі» (1846 г.) падзяліў Русь на «Чорную», пад якой разумелася зямля «производящая красильные травы и червец в стране полуденной», і «Белую», названную так «по великим снегам, выпадающим в стороне северной».



На думку М.О. Кояловіча, Е.Ф. Карскага і некаторых іншых вучоных,
паняцце «белая» трэба звязваць з перавагай у вопратцы жыхароў беларускіх зямель белых адценкаў, а таксама з наяўнасцю у белорусаў светлых валос и светло-шэрых вачэй.





Заслугоўваюць увагі і наступные версіі паходджання тэрміна “Белая Русь”:

- “Белая” , значыць,  свабодная ад татара-манголаў, крыжаносцаў
- “Белая”, значыць, хрысціянская, у адрозненне ад заходняй, “чорнай” Русі, дзе доўгі час яшчэ захоўвалася язычніцтва
- “Белая”, значыць, заходняя , згодна з сімволікай, прынятай у балцкіх плямён

Упершыню назва «Белая Русь» з'явілася ў XII ст. і адносілася да Растова-Суздальскага княства.



**У адносінах да тэрыторыі сучаснай Беларусі тэрмін “Белая Русь “ пачаў ужывацца з канца 14 ст.Саманазва “беларусцы” выкарыстоўвалася з 16 ст. Паўночныя,заходнія паўднёвыя межы этнічнай тэрыторыі вызначыліся ў 13-14 стагоддзя усходняя мяжа – ў 16 стагоддзі**

# Нацыянальная мова

Нацыянальная мова фарміруецца на аснове народнасці. Беларускую мову перыяду 13 -16 ст. прынята называць старабеларускай. Яна фарміравалася пад уплывам усходнеславянскай літаратурнай мовы і выступала як асобная славянская мова. На працягу 15 – 16 ст. на ёй была створана багатая пісьмовая спадчына,вялікая



# Адукацыя ў 13-16 стагоддзях

- Пачатковыя школы пры праваслаўных брацтвах (Вільно, Магілёў, Брэст і інш.)
- Школы пры пратэстанцкіх абшчынах (арыянскія, кальвінісцкіе, лютэранскіе)
- Школы пры каталіцкіх манастырах
- Езуіцкіе школы і калегіумы
- Вышэйшыя  навучальныя ўстановы (першая – адкрытая ў 1579 г. у Вільно Езуіцкая акадэмія)

# Літаратура

**Францыск Скарына (каля 1490 – 1551) – беларускі і ўсходнеславянскі гуманіст, першадрукар, асветнік, вучоны, пісьменнік, філосаф.**



**Нарадзіўся ў сям'і купца Лукі Скарыны ў старажытным Полацку.**

**Першапачатковую адукацыю атрымаў у Полацку і Вільні.**

**У 1504-1506 гг. – студэнт філасофсага факультэта Кракаўскага універсітэта, які скончыў са ступенню бакалаўра. Пазней атрымаў званне доктара філасофіі.**

**У 1512 г. Ф. Скарына ў Падуі – асноўным універсітэтскім цэнтры Венецыянскай рэспублікі – пасьпяхова здаў экстэрнам (без навучання) экзамен на ступень доктара медыцыны**



Ф.Скарына трымае экзамен на ступень доктара медыцыны

**6 жніўня 1517 г. Ф.Скарына першы сярод усходніх славян выдаў у чэшскім горадзе Празе (на роднай зямлі не было яшчэ неабходных умоў для пачатку друкарскай справы) друкаваную кнігу – першую кнігу Бібліі – Псалтыр.**



Прага

Значнасць таго, што зрабіў Ф. Скарына, заключаецца ў надрукаваных ім 20 кнігах Бібліі. Ён зрабіў пераклад Бібліі на мову, набліжаную да беларускай і зразумелую простаму люду – царкоўнаславянскую мову ў беларускай рэдакцыі.

Кнігі Бібліі ўключаюць прадмовы і пасляслоўі Скарыны, 51 гравюру – друкаваныя адбіткі на паперы з пласціны (дошкі), на якую нанесены малюнак.

Скарына тройчы надрукаваў у выдадзеных ім кнігах уласны партрэт. Гэта адзіны выпадак за ўсю гісторыю выданняў Бібліі ва Усходняй Еўропе.



Гравюрны партрэт Скарыны

**Друкарская дзейнасць Скарыны працягвалася на тэрыторыі ВКЛ. У наладжанай ім у сталіцы ВКЛ Вільні друкарні ў 1522 і 1525 гг. ён выдаў дзве кнігі: “Малую падарожную кніжку” і “Апостала”.**

**Скончыў Ф.Скарына сваё жыццё ў Празе каля 1551 г.**

**Яго спадчына налічвае 25 выданняў, на якія раўняліся яго паслядоўнікі.**


Починаетьсѧ книга
дѣѧнии и посла
ниѧ апостольскаѧ зо
веми апостолъ, збо
жию помочью справ
лена докторомъ фран
цискомъ скориною
сполоцька :~

Тытульны ліст “Апостала”

# Мікола Гусоўскі (1470 — пасля 1553)

**Мікола Гусоўскі (1470 — пасля 1553)**



# “Песня пра зубра”



Пісаў у публіцыстычным, эпічным, гераічным, лірычным, гістарычным і сатырычным жанрах. У 1522 г. па загаду папы Рымскага ён стварыў свой лепшы твор «Песня пра зубра». Усе часткі твора аб’яднаны тэмай лёсу радзімы, адданасці роднай зямлі. Ярка паказаў жыццё мужных, працавітых людзей, паляўнічых,

ратнікаў, бортнікаў, аратых, іх працоўную і ратную дзейнасць,побыт і звычаі,

ідэалізаваў вобраз вялікага князя Вітаўта. Зубр у паэме - алегарычны вобраз роднага краю, сімвал яго былой магутнасці. Паэма напісана на класічнай латыні.

# Сымон Будны
## (1530 – 1593)



**Беларускі пісьменнік, публіцыст і кнігавыдавец, пратэстанцкі царкоўны дзеяч. Будны заснаваў у Нясвіжы друкарню, пры якой была пабудавана і паперня (майстэрня па вырабе паперы). 10 чэрвеня 1562 года ў Нясвіжскай друкарні выйшла першая кніга — «Катэхізіс». Ён уяўляе сабой кароткія пытанні на рэлігійную тэму і разгорнутыя адказы. Спецыфіка мовы заключаецца ў тым, што побач са старабеларускай мовай прыводзяцца вялікія цытаты на царкоўна-славянскай мове. «Катэхізіс» быў створаны дзеля пашырэньня асветы — «для простых**

# Тытульная старонка “Катэхізіса”



# Васіль Цяпінскі
# (1530 -1603)



Гуманіст, пісьменнік, кнігавыдавец, перакладчык. Васіль Цяпінскі прадоўжыў гуманістычныя і культурна-асветніцкія традыцыі Францыска Скарыны, быў асабіста і ідэйна звязаны з Сымонам Будным. У 1570-я гады Васіль Цяпінскі на свае сродкі арганізаваў друкарню з намерам выдаваць кнігі на русінскай мове. Хацеў надрукаваць Евангелле на царкоўнаславянскай і русінскай мовах. У Евангеллі было размешчана 210 слоў-перакладаў,якія тлумачылі на палях незразумелыя словы.Яно было адрасавана і дарослым,і дзецям,і ўсім,хто жадае пачытаць. Асветніцкая праграма Цяпінскага была разлічана на ўздым нацыянальнай культуры, школьнай справы, пісьменства, кнігадрукавання, умацаванне пазіцый русінскай мовы.

# Напрамкі літаратуры

-  Летапісанне ( “Летапісец вялікіх князей Літоўскіх”, “Хроніка Вялікага княства Літоўскага, Рускага і жамойцкага” “Радзівілаўскі летапіс” і інш.)
-  Гістарычная літаратура (Хроніка Быхаўца Хроніка М.Стрыйкоўскага, Хроніка Быхаўца)
-  Палемічная літаратура (Л. Карповіч, І. Пацей,

  С. Зізаній



“Ворыва і будоўля”  - мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу


Rod Welikich Kniazeÿ Litowskich, z Pokolenia a z rodu.....

Старонка «Хронікі Быхаўца»

# Архітэктура




Лідскі  замак. Пабудаваны ў 13





Крэўскі замак. Пабудаваны ў 14 ст.



Крэўскі замак. Малюнак М. Арды.



Замок в Новогрудке.
Реконструкция
по материалам М. А. Ткачева
Художник Е. Кулик







**Царква ў Сынкавічах**



Царква ў Мала-Мажэйкаве



“Троіцкі касцёл” у в. Ішкальдзь (1472 г.)



# Жывапіс



# “Маці боская замілаванне ”

# Маларыта, 14-15 стст.



“Маці боская Ерусалімская”

Пінск, 16 ст.







Лаўрышаўскае евангелле





Старонкі з Радзівілаўскага летапісу